

ПТУШКІ І МЫ



№13
2008







1 Малая белая і егіпецкая чаплі
2 Шэрая чапля і белы бусел
3 Чапля-кваква (маладая асобіна)
4 Вадзяны пастушок
5 Кулік-перавозчык





Фота
Таццяны РАМАНАВАЙ

Час – паняцце адноснае. Іншы жывы арганізм за некалькі тыдняў, а часам дзён і нават гадзін праходзіць увесь свой жыццёвы шлях, прызначаны яму Маці-прыродай. Для эвалюцыі ж відаў і экасістэм, не кажучы ўжо пра больш глабальныя працэсы, век, а то і тысячагоддзе не тэрмін. А што такое дзесяць гадоў у станаўленні і развіцці арганізацыі? Цяжка адказаць адназначна.

Шмат у свой час вялося спрэчак: а колькі ж нам год на самай справе – дзесяць (утварэнне АПБ) ці дваццаць тры (утварэнне Беларускага арніталагічнага таварыства)? Здаецца мне, што, калі абстрагавацца ад фармалістыкі, не так гэта і актуальна. Ёсць старая прымаўка: «Чалавеку столькі гадоў, наколькі ён сам выглядае». Можна гэта ў поўнай меры аднесці і да нашага агульнага ўзросту. Выглядае АПБ, без перабольшання кажучы, не на дзесяць і не на дваццаць тры, калі меркаваць па справах – а менавіта так і мяркуюць аб арганізацыях, – а на значна больш сталы ўзрост. Няма сэнсу пералічваць тут асноўныя дасягненні «Аховы птушак», рабілася гэта ўжо не раз, дастаткова згадаць толькі тое, што за параўнальна кароткі тэрмін АПБ паспела «напрацаваць» сабе вядомасць і аўтарытэт не толькі ў нашай краіне, але і далёка за яе межамі. Дзяржаўныя структуры, грамадскія аб'яднанні, сродкі масавай інфармацыі, проста людзі, якія цікавяцца прыродай, ведаюць нас вельмі добра. А што тычыцца фармальнай колькасці год, то многія з сучасных актывістаў АПБ калісьці з'яўляліся не менш актыўнымі сябрамі як Заходне-Беларускага таварыства аховы птушак, так і Беларускага арніталагічнага таварыства, на аснове якіх дзесяць год таму і ўтварылася «Ахова птушак». Памянялася шыльда, пытанні ж, якія гэтых людзей хвалявалі і хвалююць, справы, якія яны рабілі і робяць, прынцыпова не змяніліся, ды, бадай што, і не зменяцца ў бліжэйшы час – экалагічныя праблемы, на жаль, не вырашаюцца так хутка. А пераломны 1998 год можна разглядаць проста як дасягненне арганізацыяй паўналецця, поўнай даросласці, пераход яе на якасна новы, міжнародны ўзровень. Так што тое, што мы зараз святкуем дзесяцігоддзе АПБ (дарэчы, ужо «Аховы птушак» не «Беларусі», а «Бацькаўшчыны», яшчэ адна кропка адліку?), праведзенае пад сцягамі Birdlife, на мой погляд, зусім не азначае, што праз два гады мы не будзем мець падстаў не менш урачыста адсвяткаваць дваццаць пяць год са дня нараджэння арганізаванай грамадскай дзейнасці па ахове птушак у Беларусі.

Пэўна, толькі знаходзячыся ў самым эпіцэнтры падзей, можна ў поўнай меры адчуваць іх дынаміку і іх вынікі і даваць ім адэкватную ацэнку. Такая рэдкая магчымасць у мяне ёсць, так што, выказваючы свае прыватныя высновы, вельмі спадзяюся, што іх падзеляць і нашы чытачы.

Нас ведаюць і паважаюць, з намі лічацца, у нас незлічона сяброў і крыху нядобразычліўцаў (а гэта, згадзіцеся, таксама крытэрый), да нас прыходзяць і тэлефануюць з пытаннямі, праблемамі, у пошуках дапамогі і парады, нашы друкаваныя выданні і фільмы запатрабаваныя, нашы святы святкуюцца, нашы мерапрыемствы збіраюць людзей, нашы праекты працуюць, нашы планы кіравання кіруюць, у рэшце рэшт, нашы птушкі жывуць, а адпаведна жывём і мы, і, хочацца верыць, жывём не дарэмна.

Сяргей ЗУЁНАК

ЗМЕСТ

ПТУШКІ І МЫ
№13'2008



На здымку: **Звычайная чачотка**
(фота Мікалая Гулінскага)







Галоўны рэдактар: Віктар Фянчук
Адказны рэдактар: Сяргей Зуёнак
Рэдакцыйная рада: Уладзімір Іваноўскі, Аляксандр Вінчэўскі, Дзмітры Вінчэўскі, Ігар Бышнёў, Ірына Самусенка, Сяргей Плыткевіч, Павел Пінчук.

Распаўсюджваецца бясплатна сярод сяброў АПБ
Рэгістрацыйны №2714 ад 27.06.2008 г.
Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь

Наш адрас:
АПБ, а/с 306, Мінск, 220050, Беларусь
Тэл.: (017) 263 01 30. Факс (017) 263 06 13
E-mail: APB@tut.by. **http://ptushki.org**

Дзейнасць АПБ падтрымліваецца Каралеўскім Таварыствам Абароны Птушак (RSPB), партнёрам BirdLife International у Вялікабрытаніі
АПБ з'яўляецца афіцыйным прадстаўніком BirdLife International у Беларусі





Выдавецтва «Рыфтур». Ліцэнзія №02330/0131891 ад 2.03.2004 выдадзена Мініфармацыі РБ.
Надрукавана ў тыпаграфіі «Джи энд Ди».
Ліцэнзія №02330/0150065 ад 15.06.2008 выдадзена Мініфармацыі РБ. Наклад 1000 ас. Замова №08102

АХОВЕ ПТУШАК БАЦЬКАЎШЧЫНЫ – 10 ЛЕТ

Михаил НИКИФОРОВ, первый президент АПБ

В существовании организации, в ее истории 10 лет – сравнительно небольшой отрезок времени. Не будь за этим массы ярких событий, важных результатов, запоминающихся эпизодов, эта дата и этот маленький юбилей не вызывал бы тех чувств, которые охватывают, я почти уверен, каждого из людей, причастных к «Ахове птушак». У меня это прежде всего чувство гордости за АПБ, радостное ощущение себя частью этого коллектива орнитологов и не только, осознание своей сопричастности к делам, событиям и результатам, вызывающим у широкого круга неравнодушных к природе людей не только любопытство, интерес, но также и восхищение, желание и готовность к совместным и активным действиям.



Участие в жизни и деятельности АПБ профессиональных орнитологов, квалифицированных ученых в других областях знаний позволяет находить правильные пути решения сложных экологических проблем, предлагать верные объяснения событий, происходящих в мире живой природы, что способствует поддержанию высокого уровня доверия и авторитета организации. В свою очередь для ученого такое сотрудничество дает возможность в значительно большей степени, чем просто в профессиональной деятельности, ощутить социальную значимость и востребованность своих знаний, своей активности, труда и опыта. А это чрезвычайно важный стимул, побуждающий к дальнейшему поиску нового.

Успехи АПБ за 10 прошедших лет очевидны. Результаты значительны и значимы не только для тех, кто их достиг. Большинство наших акций и достижений не нуждаются в дополнительной рекламе, так как они сами по себе популярны, известны, широко признаны и поддержаны. Марки с изображениями наших птиц разошлись по свету; монеты с Птицей года стали желанными сувенирами и подарками, вошли раритетами во многие нумизматические коллекции; научные публикации в Subbuteo пополнили и продолжают пополнять научный багаж в области фаунистики и экологии птиц; учеты птиц, соревнования и конкурсы привлекают к участию, к получению новых знаний все более широкий круг любителей природы. Все это вместе взятое обеспечивает высокое имя и достойное место АПБ в истории развития экологического движения не только в нашей стране, но и за ее пределами. Не каждый может стать ученым, но каждый может быть активным знатоком и защитником птиц и природы в целом, что, в принципе, неразделимо.

Радует, что сегодня упоминание в средствах массовой информации «Ахове птушак» – это не заметки о каких-то чудаках-натуралистах или забавных акциях любознательных любителей природы. Как правило, это веское мнение заслуживающих доверия специалистов, экспертов и консультантов по тем или иным вопросам экологии, охраны животного мира и среды обитания. Нередко это интересные рассказы об увлекательных и полезных акциях, событиях и результатах, профессиональная точка зрения по острым социальным и природоохранным проблемам, достоверная информация о новостях в мире птиц.

АПБ – известное имя. У этого имени есть свое лицо. За ним стоит благородство помыслов и желание следовать высоким целям. Все вместе это большой коллектив единомышленников, реализующих свои способности, таланты, прогрессивные взгляды, желания и умения на благо общего дела.

Так что у АПБ, безусловно, заслуженный юбилей. И все, кто торил этот путь длиной в десятилетие, пусть даже не с самого начала, но до сегодняшнего момента, достойны этого праздника и поздравлений.

Говоря об «Ахове птушак», не хотелось бы ограничиться только общими фразами, не упомянув конкретных людей, стараниями которых организация приобрела свое лицо и свою популярность. Естественно, вклад разных людей, входящих в «актив» АПБ, очень разнится как по объему, так и по значению, влиянию и весу, что, однако, не умаляет ценности каждого для организации. Тем не менее, сегодня стоит особо остановиться на некоторых, на мой взгляд, ключевых фигурах. И прежде всего такой фигурой я считаю бывшего директора АПБ Александра Винчевского. Еще в начале пути, в юном возрасте нашей организации именно директором ей были привиты свойства и качества общественной природоохранной структуры, которые сегодня отличают АПБ от научного общества в традиционном его понимании. При наличии багажа научных знаний Александру не был свойственен стереотип научного работника, он просто не успел у него сложиться в полной мере. Но при этом ярко выделялись нормальные амбиции и способности лидера, был уже некоторый опыт общественной деятельности, относительно независимой от зашоренных понятий и давления авторитетов.

Окончание на стр. 6

«РОЗОВЫЙ» ЭТАП ЗЕЛЕНОЙ ОРГАНИЗАЦИИ

Владимир ИВАНОВСКИЙ, председатель АПБ

С момента основания АПБ прошло 10 лет. Десять лет – хороший повод, чтобы оглянуться назад. Более того, этот этап жизни организации совпадает с окончанием четырехлетней стратегии АПБ – двойной повод для осмысления пройденного пути.

Если трактовать определения буквально, то полноправный юбилей, конечно, наступает только в 50 лет. По народному календарю, 10 лет – это розовый юбилей. Чем же ознаменован «розовый» этап жизни АПБ?

Опираясь на обширный опыт партнеров, BirdLife International, молодая организация привнесла многие новаторские идеи в охрану природы Беларуси. Такие привычные теперь Планы управления территориями и видами впервые разрабатывались в рамках проектов АПБ. Структуры управления заказниками впервые создавались на Споровском и Званце в рамках проекта по сохранению вертлявой камышевки. Теперь, когда в большинстве заказников республиканского значения созданы администрации, тяжело представить, что так было не всегда.



Кошение и очистка от закустаренности болот и пойменных лугов, выпас и контролируемые палы сейчас стали мероприятиями госпрограммы по развитию ООПТ, а ведь еще недавно это были смелые идеи удивительных людей, зачастую натыкавшихся на непонимание проблемы. А внедрение контролируемых палов еще и сейчас требует немало усилий по убеждению скептиков.

Взлет кампании «Птица года» вызывает восхищение – вслед за ставшими уже традиционными марками выходят и монеты с «Птицей года». Кампании и акции привлекают сотни и тысячи участников – как традиционные «Осенние дни наблюдений за птицами», «Зимние учеты», так и новые – «Живая весна», «Соловьиные ночи».

Вызов нового тысячелетия – глобальное потепление климата. Отрадно, что и здесь АПБ старается быть одним из новаторов, изучая роль болот как наиболее устойчивых и эффективных поглотителей углекислого газа. Работая в проекте по восстановлению нарушенных торфяников, АПБ старается обеспечить устойчивость процесса восстановления и управления нарушенных торфяных болот с привлечением механизмов Киотского протокола.

По оценкам специалистов, АПБ сейчас – одна из немногих действительно профессиональных экологических общественных организаций в Беларуси. В АПБ – 13 отделений, свыше 100 школьных клубов «Крылатый дозор», более 2000 членов. В штате АПБ – 11 сотрудников. В маленьком офисе АПБ на Макаенка, 8 бывает «яблоку негде упасть». С момента создания организации на сохранение биоразнообразия Беларуси привлечено свыше 5 миллионов долларов. Это достижения, которыми можно гордиться, но на которых, безусловно, не нужно останавливаться.

Основа достижений АПБ за эти 10 лет – наличие ясных приоритетов и четкой стратегии деятельности, плодотворное сотрудничество с партнерами BirdLife International, особенно с Королевским обществом защиты птиц (RSPB). Важно отметить, что основа успеха АПБ заложена 23 года назад, когда было создано Белорусское орнитологическое общество (БОО). Именно БОО вместе с Западно-Белорусским орнитологическим товариществом (ЗБТАП), созданным в 1996 году, объединило людей, заинтересованных в изучении и охране птиц.

Все эти достижения, безусловно, стали возможны только благодаря тесному сотрудничеству со структурами Минприроды, Минлесхоза, Минобразования, районными властями, академическими институтами и многими другими организациями. Уверен, что и последующие годы станут годами сотрудничества для сохранения уникальной природы Беларуси. Вместе для птиц и людей!

АХОВЕ ПТУШАК БАЦЬКАЎШЧЫНЫ – 10 ЛЕТ

Михаил НИКИФОРОВ, первый президент АПБ

Окончание. Начало на стр. 4

При этом свойственная Александру высокая ответственность за общее дело, а также адекватность оценок и реалистичность воззрений удерживали его и от крайне радикальных, экстремистских позиций, что, к сожалению, нередко приходится наблюдать в рядах деятелей НГО.

Конечно, Александр Винчевский был не один. Команду, взявшуюся тогда за дело, с уверенностью можно считать достойной результатов, которыми сегодня гордится АПБ. Эта команда слагалась как из непосредственных помощников А.Винчевского – директора по развитию и связям с общественностью Игоря Бышнева и директора по вопросам охраны природы Александра Козулина, так и из первого состава совета АПБ. Очевидно, что выдвинутые на историческом семинаре на Выгонощанском озере в 1998 г. лозунги и цели первого стратегического плана АПБ увлекли всех. И хотя абсолютной уверенности в успешной реализации стратегии, как показали тогда данные опроса, ни у кого не было, втайне, наверное, каждый, как и я сам, думали: «а вдруг!»

Надежды эти сбылись, сегодня ни у кого нет сомнений на этот счет. И мне особенно приятно вспомнить всех участников того далекого установочного семинара поименно. Это были: Александр Винчевский, Игорь Бышнев, Владимир Ивановский, Александр Козулин, Михаил Никифоров, Ирина Самусенко, Николай Черкас, Валерий Юрко, Борис Яминский. Вместе с нами работали наши кураторы от Королевского общества защиты птиц из Великобритании Норберт Шэффер и Дитер Хофман, а также Петар Янков от Болгарского общества охраны птиц.

Визитная карточка АПБ – наша печатная продукция, и прежде всего периодические издания. А первое среди них – «Птушкі і мы». Полагаю, что этот журнал, несмотря на его научно-популярный характер, а может, и благодаря этому – один из наиболее удачных проектов АПБ. Так как главными объектами внимания авторов и иллюстраторов являются прекраснейшие существа – птицы, а также любящие их люди, каждый номер журнала, на мой взгляд, становится самым желанным и ожидаемым продуктом АПБ. В нем органично сочетается интересная информация о делах, исторические очерки, любопытные заметки, прекрасные фотоиллюстрации и детские рисунки.

История «ПіМ», как неотъемлемая часть общей истории «Аховы птушак» в целом теперь уже навсегда связана с именами основоположников и основных авторов – Игоря Бышнева, Василия Гричика, Сергея Зуенка, Дмитрия Винчевского и других. Сам журнал, несмотря на небольшое число вышедших номеров, уже сегодня калейдоскоп нашей истории. Здесь все датировано и документировано. Смена эмблемы – номер 8, год 2006. Появление региональных отделений АПБ. Развитие, результаты и достижения научных и практических проектов. Годы и юбилеи известных в орнитологии людей. История изучения вертлявой камышевки, динамика событий на Туровском лугу, в колонии птиц в устье Лани. По большому счету здесь годы становления и развития нас самих, наших интересов, способностей, профессиональных качеств.

Несмотря на успешность издания, предел для его совершенствования еще далеко не достигнут. И для поддержки привлекательности и популярности журнала нам надо стараться развивать лучшие его качества и характеристики, использовать новации в подходах и подаче материала, его оформлении. Здесь, как и в любом соревновании, остановиться – значит проиграть.

Сегодня во главе АПБ, его директората новая генерация. Постепенно обновляется и состав совета. Все весомее голос регионов. Нельзя сказать, что смена актива происходит очень болезненно. На мой взгляд, организация вполне закономерно эволюционирует, и в этом видится залог соблюдения преемственности развития. Новое поколение привносит свежие идеи, мысли и подходы, хотя, бывает, грешит то пассивностью, то излишним радикализмом, поспешностью и категоричностью. Но верится, что опыт и участие основателей, исторический багаж и традиции предшественников будут и впредь придавать устойчивость всему кораблю АПБ.

Счастливого плавания!

Орнитологический калейдоскоп

Продолжается катастрофическое падение численности кулика-лопатня.

Лопатень *(Eurynorhynchus pygmeus)* –



реликтовый вид, эндемик России. Гнездится в узкой полосе приморской тундры на берегах лагун Чукотки и Камчатки. Многолетние исследования, начатые на Чукотке в 2000 г. в рамках Арктической экспедиции РАН, показали катастрофическое падение численности за последние 10–15 лет. В настоящее время общая численность лопатня достигла критической отметки в 200–300 пар. Падение численности в ключевых местах гнездования превысило 70%.

Причины столь резкого сокращения численности до конца не ясны. Значительно снижают успех размножения такие факторы, как беспокойство на местах размножения, незаконный отстрел и сбор кладок, хищничество наземных и пернатых хищников. Наряду с этим существенное влияние оказывают также охота, неблагоприятные изменения окружающей среды и прямая потеря местообитаний на миграционных путях и зимовках в Юго-Восточной Азии.

П. Пинчук

***



В декабре 2005 г. в рамках двухлетнего проекта Службы рыбы и дикой природы США и Геологической службы США на атолле Мидуэй (Гавайи, США) были выпущены 22 лайсанских чирка *(Anas laysanensis)*. До прибытия людей на Гавайи 1500 лет назад эти утки были обычными на всех островах архипелага. Сейчас этот вид чирка является глобально исчезающим. В свое время на земле оставалась только одна пара птиц. Самец погиб, оставив самку, которая смогла успешно вырастить птенцов. С тех пор популяция чирков колебалась между 100 и 600 птицами. Более 100 лет птицы пытались выжить на крошечном островке Лайсан, площадью всего лишь в 3,7 км². Здесь они страдали от нехватки пищи, сокращения площади местообитания и имели низкий успех размножения. Проект имел своей целью восстановить популяцию чирков на острове Мидуэй,

Окончание на стр. 21

ЕЎРОПА Ў ПАГОНІ ЗА ПТУШКАМІ

Дзмітры ВІНЧЭЎСКІ, Сямён ЛЕВЫ

«Гонка за птушкамі» – так перакладаецца Birdrace, назва гэтых своеасаблівых спаборніцтваў з англійскай мовы. І хаця ў большасці краін слова выкарыстоўваецца без перакладу, часам ужываюць сінонімы: Birdrally, Bird або Ornithological marathon (Птушыны ці Арніталагічны марафон).

Калі і ў якой краіне нарадзілася ідэя правядзення камандных назіранняў за птушкамі на працягу нейкага пазначанага часу, знайсці пакуль не атрымалася. Аднак у Еўропе ўжо ў 1980-я гады гонкі праводзілі ў розных рэгіёнах Вялікабрытаніі і Швецыі. Дарэчы, у апошняй яны былі самымі разнастайнымі па працягласці: 9-, 12- і 24-гадзінныя. Менавіта сябры Шведскага арніталагічнага таварыства (SOF) (а таксама і сябры АПБ) Ленарт Карлсан і Хокан Ёртман прывезлі ідэю правядзення падобных спаборніцтваў у Беларусь.



Рэгіянальныя асаблівасці

Звычайна спаборніцтвы праводзяцца ў канцы вясны або лета, пад час міграцыі, калі ўдзельнікі маюць больш шанцаў адзначыць шмат розных відаў птушак. Але па меншай меры ў Англіі і Фінляндыі вядомыя і рэгіянальныя зімовыя «гонкі», на якіх каманды звычайна рэгіструюць не менш за 100 відаў.

Найбольш распаўсюджаныя 24-гадзінныя спаборніцтвы. У Вялікабрытаніі каманды складаюцца з 3-4 чалавек, а від залічваецца, калі яго бачылі ці чулі не менш за трох удзельнікаў. Зрэдку могуць удзельнічаць каманды з 2-х чалавек. Час правядзення: з 18.00 суботы да 18.00 нядзелі ў сярэдзіне траўня, а таксама ў жніўні. Лакальныя бёдрэйсы праводзяцца ў Ланкашыры (Англія) штогод з 1995 г., часцей ў красавіку, зрэдку – у траўні ці нават у чэрвені з поўначы да поўначы. Рэкорд быў пастаўлены ў канцы красавіка 2006 года – адна з каманд адзначыла 133 віды. У Шатландыі 24-гадзінны бёдрэйс праводзіцца штогод у пачатку сакавіка, звычайна спісы каманд складаюцца прыкладна са 100 відаў. Арганізуе і забяспечвае каманды транспартам і маршрутамі адзін з мясцовых гатэляў, які зарабляе на гэтым немалыя грошы.





2nd Austrian BirdRace

У Швейцарыі «гонкі за птушкамі» адбываюцца ў канцы жніўня – пачатку верасня з 1990 г. У 2006-м удзельнічала 11 каманд, у 2007-м – 13. Цікава, што адна і тая ж каманда перамагала са 125 відамі ў 2006–2007 гг. Сярод 17 каманд пад час апошняй «гонкі» 06.09.2008 перамагла з тым жа вынікам – 125 відаў, але ўжо іншая каманда.

У Фінляндыі Bird Marathon у гэтым годзе прайшоў 6 чэрвеня. Перад пачаткам каманды павінны былі выбраць яго фармат: 18 ці 24 гадзіны. Каманды складаюцца з 2–5 чалавек, узрост удзельнікаў не важны. Каб від быў залічаны, яго павінны пазнаць (убачыць альбо пачуць) 2/3 каманды. Пад час спаборніцтваў нельга наведваць з мэтай залічыць новы від вядомыя гнёзды вялікіх драпежнікаў – арлоў, арланаў, соў. У гэтай краіне кожны травень праводзіцца і вялікая колькасць рэгіянальных спаборніцтваў, сярод якіх і самыя працяглыя – 25-гадзінныя птушыныя ралі ў Паўночнай Ботніі.

У сталіцы Ірландыі Дубліне ў пачатку студзеня штогод праходзяць гарадскія бёдрэйсы. У гэта цяжка паверыць, аднак у мінулым годзе каманды ў межах горада здолелі адзначыць 120 відаў птушак, а каманда-пераможца мела ў сваім спісе ажно 105 відаў!

У Даніі час назіранняў падобны на беларускі фармат – 9 гадзін, толькі спаборнічаюць каманды ў канцы траўня і з 5.00 да 14.00. У 2008 годзе за птушкамі ганялася 47 каманд. Акрамя травеньскіх гонак, ёсць яшчэ і штогадовы ў кастрычніку.

У Венгрыі асобна для дарослых і юніёраў пачынаючы з 2000 г. праводзяць 12-гадзінныя бёдрэйсы.

У ФРГ нягледзячы на нядаўнюю гісторыю (першая гонка стартавала толькі ў 2004 годзе), самымі масавымі застаюцца 24-гадзінныя спаборніцтвы, якія праводзяцца па ўсёй краіне. У апошнім ралі, якое адбылося ў траўні гэтага года, удзельнічала 116 каманд, прычым прыкладна пятую частку ўдзельнікаў складалі жанчыны!

У Аўстрыі першы бёдрэйс прайшоў у чэрвені 2005 года, удзельнічала ў ім 11

камандпа 2–4 чалавекі ў кожнай. Перамагла каманда, якая адзначыла 77 відаў птушак. У гэтым годзе ў 24-гадзінным марафоне спаборнічалі ўжо 42 каманды. Разам яны адзначылі 205 відаў, а каманда-пераможца – 128 з іх.

Нетыповы 10-гадзінны фармат маюць «птушыныя ралі» ў Літве. У склад каманд у гэтай краіне, што таксама нетыпова, ды і не зусім зразумела, можа уваходзіць ад 2 да 7 чалавек. Пачынаюцца і заканчваюцца гэтыя спаборніцтвы недалёка ад арніталагічнай станцыі Вентас Рагас, якую заснаваў у 1929 годзе наш зямляк, акадэмік Тадэвуш Іваноўскі. У апошнім ралі, якое адбылося ў канцы кастрычніка мінулага года, у адной з каманд удзельнічаў і беларус. Рэгістраваліся толькі віды, адзначаныя не менш як двума назіральнікамі. Перамагла фінская каманда, якая зарэгістравала 102 віды птушак.

З 1990-х гадоў праводзяцца арніталагічныя марафоны ў Каталоніі, а з 2002 года гэтыя спаборніцтвы пачалі штогод праходзіць у сярэдзіне альбо ў канцы красавіка па ўсёй Іспаніі. Менавіта каталонская каманда ў мінулым годзе паставіла еўрапейскі рэкорд, адзначыўшы за суткі 217 відаў птушак! Цікава, што на тых жа спаборніцтвах іншая каманда на Канарскіх астравах здолела знайсці толькі 37 відаў.

А вось у Расіі першы бёдрэйс адбыўся ўпершыню гэтай восенню ў Падмаскоўі.

Шмат дзе напярэдадні і на працягу «гонак» збіраюцца ахвяраванні на вывучэнне і ахову птушак. Таму такія спаборніцтвы, акрамя вялікага задавальнення ўдзельнікам, прыносяць пэўную карысць і птушкам. А ў некаторых краінах па дадзеных назіранняў з гонак нават пішуць навуковыя артыкулы, у якіх аналізуюцца змены ў характары міграцыі розных відаў, а таксама абмяркоўваюцца іншыя цікавыя назіранні.

Іншыя спаборніцтвы

У многіх краінах у найбольш цікавых месцах для назірання птушак будуюць спецыяльныя назіральныя вежы. Менавіта паміж камандамі, якія знаходзяцца на такіх пабудовах, і праводзяцца «Бітвы вежаў». Першыя такія спаборніцтвы адбыліся ў 1991 годзе ў Фінляндыі і праз нейкі час сталі папулярнымі і ў іншых краінах Еўропы.

У Латвіі першая «Бітва вежаў» была арганізавана ў 2002 годзе, у ёй прынялі ўдзел 3 каманды, якія назіралі птушак з вежаў на ўзбярэжжах трох розных азёр. Тады каманда пераможцаў у канцы траўня за 24 гадзіны назірала 77 відаў птушак. У 2005 годзе ў спаборніцтвах прынялі ўдзел ужо 7 каманд. Перамагла каманда, якая адзначыла 83 віды птушак.



Правілы: У камандзе павінна быць 3 або 4 ўдзельнікі. Від залічваецца, калі яго ўбачылі/пачулі 3 сябры каманды. Нельга выкарыстоўваць ніякіх прыстасаванняў для прыцягнення ўвагі птушак. Рэгістраваць віды можна было толькі з вежы. Цікава, што любы чалавек можа наведаць адну з каманд і задаць пытанні наконт спаборніцтваў і ўвогуле пра птушак.

У гэтым годзе ў Швецыі праводзіўся юбілейны, 10-ты нацыянальны чэмпіянат па назіраннях птушак з уласных падворкаў (yard birding). Пад час спаборніцтваў, якія пачынаюцца штогод 1 верасня, трэба зарэгістраваць як мага больш птушак, знаходзячыся на ўласным падворку 24 гадзіны. У гэтым чэмпіянаце штогод спаборнічаюць каля 100 удзельнікаў прыкладна з 70 сядзіб. Падворкі, з якіх назіраюцца птушкі, знаходзяцца ва ўсіх частках Швецыі: ад самага поўдня да самай поўначы. Але звычайна перамагаюць назіральнікі, якія жывуць на вялікіх астравах у Балтыйскім моры: Эланд і Готланд, або на заходнім узбярэжжы Швецыі, дзе шанцы адзначыць мігрыруючых птушак найбольшыя. Цікава, што адзін з бёдуотчараў набыў на востраве Эланд ва ўласнае карыстанне... маяк! З гэтага месца за некалькі гадоў ён адзначыў больш за 260 відаў птушак. Пад час спаборніцтваў у 2007 годзе гэты назіральнік за птушкамі ўстанавіў новы рэкорд – адзначыў за суткі 109 відаў! Акрамя гэтага амаль фантастычнага выніку, ён паправіў яшчэ адзін вынік для Швецыі – з аднаго месца (big sit birding) назіраў 108 відаў птушак.

У Беларусі «гонкі за птушкамі» пачалі праводзіцца з 2004 года. У нас яны маюць назву «Нацыянальны чэмпіянат па спартыўнай арніталогіі». Правілы чэмпіянату ў параўнанні з іншымі еўрапейскімі спаборніцтвамі больш жорсткія. Удзельнікам даецца толькі 9 гадзін і від павінен убачыць альбо пачуць кожны з чатырох членаў каманды.

На дадзены момант у нас прайшло пяць чэмпіянатаў. Штогод у спаборніцтвах выступала ад 8 да 16 каманд. Тройчы пераможцамі станавіліся Андрэй Абрамчук, Сяргей Абрамчук, Вадзім Пракапчук і Дзяніс Кіцель з брэсцкай каманды Peregrinus.





З кожным годам перамагчы ў птушынай гонцы становіцца ўсё цяжэй. Калі ў 2004 г. для перамогі было дастаткова пабачыць 88 відаў, то ў астатнія два гады нават тым, хто назіраў 100 і больш відаў, не гарантавалася першае месца. Удзельнікі сталі больш вопытнымі, яны загадзя распрацоўваюць свае арыгінальныя тактыкі спаборніцтва, больш дасканала вывучаюць тэрыторыю, дзе пройдзе іх маршрут, праводзяць своеасаблівыя трэніроўкі-назіранні напярэдадні чэмпіянату, каб паглядзець, дзе і якія віды сустракаюцца.

Беларускі чэмпіянат з'яўляецца адкрытым. Гэта значыць, што ў ім могуць прыняць удзел таксама і грамадзяне іншых краін. За пяць гадоў у склад каманд уваходзілі грамадзяне Швецыі, Вялікабрытаніі, Літвы і Фінляндыі. Як ужо згадвалася, у нас «гонкі за птушкамі» пачалі праводзіцца дзякуючы намаганням менавіта шведаў. Шведскія бёдуотчары Ленарт Карлсан і Хокан Ёртман удзел у беларускім ралі прымаюць штогод; змешаная беларуска-шведская каманда Dream Team, у склад якой яны ўваходзяць, неаднойчы станавілася прызёрам, не дабіраючы да першага месца літаральна пару відаў.

Традыцыйна для перамяшчэння каманды выкарыстоўваюць аўтамабілі. Але ёсць і выключэнні. У 2006 г. каманда «Гораздо» з Барысава пераязджала па маршруце на веласіпедах. Каманды «Слуцкія саловушкі» (Слуцк), «Alcedo» (Гомель) і «Водар» (Магілёў) выступалі пехатой. Але ж каманды на аўтамабілях маюць перавагу, таму што гэта эканоміць час для перамяшчэння паміж рознымі біятопамі, і шанцаў пабачыць розныя віды становіцца больш. Увогуле, аналізуючы праведзеныя ў нас чэмпіянаты, зараз ужо можна ўпэўнена сцвярджаць, што мы без сораму зможам выставіць некалькі беларускіх зборных каманд для выступленняў на еўрапейскім узроўні.

За дапамогу ў стварэнні артыкула дзякуем Дзмітрыя Бойка (Латвія), Хокана Ёртмана (Hakan Ortman) (Швецыя) і Аляксандра Вінчэўскага

З ГІСТОРЫІ АРНІТАЛОГІІ

ЛЕАНІД ПАЎЛАВІЧ ШКЛЯРОЎ (1938 – 2001)

Васіль ГРЫЧЫК

29 сакавіка 2008 года споўнілася 70 год са дня нараджэння беларускага арнітолага Леаніда Паўлавіча Шклярова, чалавека, з імем якога непарыўна звязана стварэнне і існаванне Беларускага арніталагічнага таварыства, якое потым стала асновай для грамадскай арганізацыі «Ахова птушак Бацькаўшчыны».

Нарадзіўся Леанід Паўлавіч 29 сакавіка 1938 года ў Мінску ў сям'і школьных настаўнікаў. У тым жа годзе сям'я пераехала на жыхарства ў г. Бранск, а з пачаткам Вялікай Айчыннай вайны эвакуіравалася ў Тамбоўскую вобласць. Адразу пасля заканчэння вайны сям'я вяртаецца на жыхарства ў родны Мінск. З верасня 1945 па 1956 гг. Леанід Паўлавіч вучыўся ў сярэдняй школе. Цікаўнасць да вывучэння жывой прыроды з'явілася ў яго ўжо ў дзяцінстве – у старэйшых класах школы ён быў адным з самых актыўных гурткоўцаў Мінскай гарадской станцыі юнатаў.

У 1956 годзе, адразу пасля заканчэння школы, Леанід Паўлавіч паступае на біялагічны факультэт БДУ. Паспяховую вучобу на факультэце ён ужо з першага курса спалучае з самастойнымі палявымі выездамі ў наваколлі Мінска (частка сабраных у той час матэрыялаў стала асновай адной з яго першых публікацый, прысвечаных зімовай арнітафауне Мінскай вобласці).

Двойчы за час вучобы Леанід Паўлавіч за ўласны кошт ездзіў на «Птушыныя базары» «Сямі астравоў» (зараз філіял Кандалакшскага запаведніка ў Баранцавым моры). Добрай школай агульнай даследчай падрыхтоўкі сталі летнія практыкі, якія ў той час нязменна праводзіла Нарачанская біястанцыя БДУ. У адну з такіх практык Леанід Паўлавіч нават стаў прататыпам персанажа дакументальнага нарыса пісьменніка Віталя Вольскага «Чайкі над Нараччу» (там ён фігуруе як «студэнт-арнітолаг Лёня»).

На 4-м курсе Леанід Паўлавіч пераводзіцца на завочную форму навучан-

Заканчэнне на стар. 17

Белая чапля і яе радня

Сяргей ЗУЁНАК

1 Вялікая белая чапля *Egretta alba*

Нешматлікі гняздуючы пералётны і зрэдку зімуючы від. Гняздуецца пераважна ў паўднёвай частцы краіны, у другой палове лета можна сустрэць на ўсёй тэрыторыі. У апошнія гады намецілася тэндэнцыя да павелічэння колькасці і пашырэння арэалу. Занесена ў Чырвоную кнігу Беларусі (III катэгорыя).

Лад жыцця. У гнездавы перыяд сустракаецца ў парослых трыснягом і хмызнякамі поймах рэк з вялікай колькасцю старыц і дробных поймавых азёр, на сажалках рыбгасаў. Падчас разлёту моладзі і міграцыі – на розных вадаёмах. Гняздуецца асобнымі парамі альбо калоніямі, часта сумесна з шэрай чапляй. Гнёзды робіць на заломах трыснягу альбо на хмызняках, зрэдку на дрэвах. Пры сумесным гнездаванні з шэрай чапляй звычайна займае перыферыйную частку калоніі. Вельмі асцярожная. Харчуецца насякомымі і дробнымі хрыбетнымі.

Ад нашых іншых чапляў адрозніваецца памерамі і белай афарбоўкай.

2 Шэрая чапля *Ardea cinerea*

Звычайны гняздуючы пералётны і часам зімуючы ў паўднёва-заходніх раёнах від. Сустракаецца па ўсёй тэрыторыі краіны ў месцах, дзе акрамя кармавых вадаёмаў (рэкі, азёры, сажалкі, вадасховішчы) ёсць хаця б невялікія ўчасткі старых лясоў альбо трыснёговыя зарасці. Гнёзды звычайна будуе ў верхняй частцы кроны высокіх дрэў, часам на заломах трыснягу, гняздуецца калоніямі ад некалькіх дзесяткаў да некалькіх соцень пар. Буйнейшая ў краіне калонія, якая знаходзіцца на тэрыторыі ТВП «Сярэдняя Прыпяць» у вусці ракі Лань, у розныя гады налічвае ад 400 да 600 і нават болей жылых гнёздаў. Харчуецца воднымі бесхрыбетнымі, амфібіямі, дробнай рыбай і іншымі дробнымі жывёламі.

Ад іншых буйных чапляў адрозніваецца шэрай афарбоўкай.

3 Чырвоная чапля *Ardea purpurea*

Рэдкі залётны, магчыма, гняздуючы ў паўднёвых раёнах від.

Лад жыцця. Звычайна засяляе забалочаныя поймы рэк і топкія ўзбярэжжы азёр з густымі зараснікамі трыснягу і хмызнякоў. Гняздуецца асобнымі парамі альбо невялікімі калоніямі. Гнёзды будуе на заломах трыснягу альбо на затопленых хмызняках, часам у кронах дрэў. Харчуецца насякомымі, дробнымі грызунамі, жабамі, вужамі, дробнай рыбай.

Ад іншых чапляў адрозніваецца рудой афарбоўкай галавы, шыі і грудзей.

4 Малая белая чапля *Egretta garzetta*

Рэдкі залётны ў паўднёвыя раёны від.

Ад іншых чапляў адрозніваецца белым колерам і дробнымі памерамі і жоўтымі пальцамі.

5 Чапля-бугай *Botaurus stellaris*

Нешматлікі гняздуючы пералётны і ў выключных выпадках зімуючы від. Сустракаецца на ўсёй тэрыторыі краіны. Занесена ў Чырвоную кнігу Беларусі (III катэгорыя).

Найбольш характэрны гнездавы біятоп – вялікія трыснёговыя зарасці на неглыбокіх вадаёмах – азёрах, вадасховішчах, сажалках рыбгасаў. Сустракаецца таксама на залітых вадой трыснёговых балотах, рачных старыцах, старых торфараспрацоўках. Гняздо ўладкоўвае на заломах расліннасці на ўзроўні вады. Вельмі асцярожная, на вочы трапляецца рэдка. Часта нерухома затойваецца сярод трыснягу і, дзякуючы асаблівасцям афарбоўкі, становіцца зусім непрыкметнай. Мае вельмі характэрны голас (нізкае глухое «бу-бу»), які чуваць на даволі далёкай адлегласці.

Ад іншых чапляў адрозніваецца характэрнай стракатай афарбоўкай.

6 Чапля-лазянік *Ixobrychus minutus*

Нешматлікі гняздуючы пералётны від. Сустракаецца па ўсёй тэрыторыі, у паўднёвых раёнах больш шматлікая. Занесена ў Чырвоную кнігу Беларусі (II катэгорыя).

Сустракаецца на неглыбокіх вадаёмах рознага тыпу з добра развітай травяністай і хмызняковай расліннасцю. Для гнездавання дастаткова невялікіх участкаў з трысцём альбо хмызнякамі, а часам нават асобных кустоў альбо трыснёговых купін. Гняздуецца асобнымі парамі, у прыдатных месцах можа ўтвараць невялікія дыфузныя калоніі. Гнёзды звычайна размяшчае ў аснаванні альбо на галінах кустоў, часам займае старыя гнёзды сарок. Харчуецца насякомымі, дробнай рыбай і хрыбетнымі. З-за ладу жыцця і асаблівасцяў паводзін на вочы трапляецца рэдка.

Ад іншых чапляў адрозніваецца дробнымі памерамі. Адзіная з нашых чапляў, у якой самцы і самкі маюць розную афарбоўку.

7 Чапля-кваква *Nycticorax nycticorax*

Рэдкі гняздуючы пералётны від. У Беларусі адзінае вядомае месца гнездавання – змешаная калонія чапляў у вусці Лані. Занесена ў Чырвоную кнігу Беларусі (IV катэгорыя).

Сустракаецца ў буйных мазаічных трыснягова-хмызняковых масівах, якія чаргуюцца з поймавымі вадаёмамі. Гняздуецца невялікімі калоніямі часта з іншымі відамі чапляў. Харчуецца дробнай рыбай і жабамі, радзей насякомымі. Вядзе начны лад жыцця.

Ад іншых чапляў адрозніваецца чорна-белай афарбоўкай пер'я і чырвонай дзюбай.

8 Жоўтая чапля *Ardeola ralloides*

Вельмі рэдкі залётны від. Вядома адзіная рэгістрацыя ў 2001 годзе ў Рэчыцкім раёне.

Ад егіпецкай чаплі адрозніваецца меншымі памерамі, пераважна жоўтым колерам на спіне і блакітнай дзюбай.

9 Егіпецкая чапля *Bubulcus ibis*

Вельмі рэдкі залётны від. Вядомы дзве рэгістрацыі ў Столінскім і Лунінецкім раёнах.

Ад малой белай і жоўтай чапляў адрозніваецца афарбоўкай грудзей і спіны.



ФОТА: МІКАЛАЙ ГУЛІНСКІ



ФОТА: ТАЦЦЯНА РАМАНАВА



ФОТА: АРХІЎ АПБ



ФОТА: СЯРГЕЙ ЗУЁНАК, БАРЫС ЯМІНСКІ



ФОТА: ДЗМІТРЫ ЯКУБОВІЧ



ФОТА: СЯРГЕЙ ЗУЁНАК



ФОТА: ТАЦЦЯНА РАМАНАВА




ФОТА: ЛАРС ЛАХМАН



ФОТА: ТАЦЦЯНА РАМАНАВА

АПБ Birdlife


Павел Пінчук, сябра Цэнтральнай Рады


Андрэй Абрамчук, сябра Цэнтральнай Рады


Сяргей Зуёнак, спецыяліст па прыродаахоўных пытаннях


Сямён Левы, спецыяліст па развіццю арганізацыі


Юлія Ягорава, сакратар


Наталля Карліёнава, сябра Цэнтральнай Рады


Уладзімір Іваноўскі, старшыня

Вадзім Пракапчук, сябра Цэнтральнай Рады ▶




Уладзімір Малашэвіч, спецыяліст па захаванню вяртлявай чаротаўкі


Мэртан Мінке, спецыяліст па парніковых газах

Міхаіл Нікіфараў, сябра Цэнтральнай Рады ▶



Belarus – 2008







Дзмітры Вінчэўскі, сябра Цэнтральнай Рады


Віктар Фянчук, дырэктар

Руслан Шайкін,
спецыяліст па кампаніях і экалагічнай адукацыі



Наталля Парэчына, сябра Цэнтральнай Рады





Анна Калеснікава, галоўны бухгалтар



Генадзь Міндлін, рэвізійная камісія



Васіль Грычык, рэвізійная камісія

Яўген Лабанаў, спецыяліст
па каардынацыі прыродаахоўных
праектаў



Святлана Пракоф'ева,
сябра Цэнтральнай Рады



Анэт Тылле,
спецыяліст-балотавед



Мікалай Чэркас,
рэвізійная камісія



◀ Надзея Ляйчонак,
менеджэр праекта





Арол-маркут

ФОТА: СЯРГЕЙ ПЛЫТКЕВІЧ



Сокал-дрымлюк

ФОТА: ЭЎГЕНІЮС ДРАБЯЛІС

Скапа

ФОТА: СЯРГЕЙ ПЛЫТКЕВІЧ

ХИЩНЫЕ ПТИЦЫ ВЕРНЫ СВОЕЙ РОДИНЕ!

Владимир ИВАНОВСКИЙ

А есть ли чувство «родины» у животных, в частности у птиц? Меня как орнитолога всегда интересовал этот феномен, именуемый по-научному филопатрией. Постепенно собирались факты по данному вопросу, как полученные в результате собственных исследований, так и почерпнутые из научной литературы. И поскольку основным объектом моих исследований были хищные птицы, то как раз по этому отряду пернатых нашлось больше всего интересных фактов. Они касались прежде всего продолжительности гнездования птиц в одном и том же месте. В мировой практике известны гнездовья хищников, которые существовали по 20, 40 и даже 125 лет! На Витебщине есть места, где самые крупные из наших пернатых хищников – орлан-белохвост и орел-беркут – живут уже более 30 лет. Но это явление гнездового консерватизма, когда пара орлов занимает одно и то же гнездо или группу гнезд, расположенных недалеко друг от друга много лет подряд, не свидетельствуют о том, что пара состоит из одних и тех же птиц. Ведь на свободе крупные пернатые хищники живут в среднем не более 20 лет. Если один из супругов погибает, то второй довольно быстро находит ему замену.

Наверное, всем известно распространенное мнение о том, что вороны живут до 300 лет. Увы, читатель, должен вас разочаровать: их век недолог, на воле не более 20–25 лет. А заблуждение о долголетии воронов родилось потому, что человек не узнает птиц «в лицо» на уровне особи, как, например, других людей. Ведь вороны – черны и все на одно «лицо», а их гнездовье на ближайшем кладбище может существовать многие десятилетия, пока существует само кладбище со старыми деревьями, удобными для постройки гнезда. Эти заблуждения были развеяны благодаря методу индивидуального кольцевания птиц, обогатившему науку фактическими материалами о продолжительности птичьей жизни, о верности птиц «родным пенатам». Но, что удивительно, в литературе практически нет фактов о гнездовании пернатых хищников в том самом гнезде, в котором они вывелись. Сам я кольцую птиц с 1972 года. И вот, наконец, мне повезло! Подтвердилось, что птицы, окольцованные еще птенцами, обосновались в том же


ФОТО: СЕРГЕЙ ПЛЫТКЕВИЧ

гнезде, где впервые увидели свет, вылупившись из яйца.

Предыстория этих интересных случаев такова. Сам я, как правило, фотографирую лишь кладки и птенцов. На то, чтобы часами ждать, когда прилетит взрослая птица, нет времени. Но, к счастью, существуют профессиональные фотографы-анималисты, которые ради нескольких удачных кадров готовы сидеть в специальной засидке у гнезда целую неделю!

